БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 373.31:91+373.31:5+371.671

ШАРУХА Ігар Мікалаевіч

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ПАЧАТКОВАЙ ПРЫРОДАЗНАЎЧА-ГЕАГРАФІЧНАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ
(са старажытных часоў да XX ст.)

13.00.01 – АГУЛЬНАЯ ПЕДАГОГІКА

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

Мінск, 2000

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Работа выканана ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце
імя А.А.Куляшова

Навуковы кіраўнік – доктар педагагічных навук,
прафесар Сідор Сяргей Іванавіч

Афіцыйныя апаненты: доктар педагагічных навук, прафесар
Серкуцьеў Г.В.
кандыдат геаграфічных навук, дацэнт
Галай І.П.

Апаніруючая арганізацыя: Нацыянальны інстытут адукацыі
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Абарона адбудзецца "28" чэрвеня 2000 г. у 12 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.19 у Беларускім дзяржаўным універсітэце (220600, Мінск, пр-т Ф.Скарыны, 4, тэл. вучонага сакратара 226—55—41).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы
Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "26" мая 2000г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар педагагічных навук,
прафесар I.I.Казімірская

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

Актуальнасць. У сучаснай сацыяльна – культурнай сітуацыі, што склалася на Беларусі пры пераходзе да рынкавых эканамічных адносін, ва ўмовах глабальнага экалагічнага крызісу адбываюцца працэсы па пераасэнсаванню адукацыйна – выхаваўчых мэт і задач, пошуку зместу сучаснай адукацыі, больш высокага тэарэтычнага ўзроўню прадметаў, разглядаюцца верагодныя мадэлі далейшага развіцця, выпрацоўваюцца новыя канцэптуальныя палажэнні, праграмы, прыкладаюцца намаганні па прывядзенню адукацыі ў адпаведнасць з запатрабаваннямі новага тысячагоддзя. У Рэспубліцы Беларусь ва ўмовах рэфармавання сістэмы адукацыі, пры пераходзе агульнаадукацыйнай школы на 12-гадовы тэрмін навучання вельмі важным з'яўляецца акцэнтаванне ўвагі на развіццё ў грамадзян XXI стагоддзя глабальнага экалагічнага мыслення.

Даследаванне праблем, што звязаны з удасканаленнем адукацыі, актуальна заўсёды, асабліва на сучасным этапе рэфармавання беларускай школы. У плане абнаўлення зместу вельмі важным з'яўляецца і аналіз гістарычнай спадчыны, які дае не толькі веды аб мінулым, але дапамагае выкарыстаць вопыт папярэднікаў на сучасным і будучых этапах развіцця навукі, увогуле сістэмы выхавання і адукацыі, і, у прыватнасці, пачатковай прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі, якая закладвае грунт пад навуковы светапогляд, з'яўляецца адной з першых прыступак у фарміраванні экалагічнай, геаграфічнай і біялагічнай культуры, у авалоданні прыродазнаўча-геаграфічнымі ведамі, навыкамі і ўменнямі.

Аналіз гісторыі развіцця, сучаснага стану дае магчымасць станоўча вырашаць на практыцы сучасныя праблемы пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі, спрыяе яе ўдасканаленню. Прыродазнаўча-геаграфічныя прадметы займаюць адно з цэнтральных месц у навучанні і выхаванні малодшых школьнікаў.

Такім чынам, актуальнасць дысертацыі абумоўлена як агульнатэарэтычнымі і практычнымі задачамі, так і недастатковай распрацоўкай пытанняў: а) гістарычнай спадчыны; б) сутнасці, ролі, месца, зместу; в) аналізу сучаснага стану; г) перспектыў і верагодных мадэляў развіцця пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі.

Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі. Дысертацыя выканана ў рамках міжкафедральнай тэмы “Гісторыя методыкі выкладання прыродазнаўства і геаграфіі”, якая распрацоўваецца на кафедрах педагогікі і методыкі пачатковага навучання, геаграфіі і аховы прыроды ў кантэксце асноўных напрамкаў навуковай дзейнасці Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова, што зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Мэтай даследавання з'яўляецца асэнсаванне гістарычнай спадчыны, сучасных працэсаў, сутнасці, мэт, абгрунтаванне ролі і месца, зместу пачатковай прыродазнаўча -геаграфічнай адукацыі ў агульнай пачатковай адукацыі для аналізу сучасных праблем, шляхоў іх вырашэння, разгляду верагодных мадэлей далейшага развіцця, выпрацоўкі канцэптуальных палажэнняў сучаснай пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі, канструявання праграмы з прыродазнаўча- геаграфічным зместам для пачатковай школы. Пастаўленая мэта прадугледжвае вырашэнне наступных задач:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

-прааналізаваць пытанні станаўлення і развіцця пачатковай прыродазнаўча –геаграфічнай адукацыі на Беларусі на асноўных этапах з асэнсаваннем спадчыны ў галіне пачатковых курсаў прыродазнаўства і геаграфіі;

-вызначыць і прааналізаваць сучасныя праблемы, асноўныя змястоўныя мадэлі;

-абгрунтаваць ролю, месца, змест пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі ў сістэме выхавання і адукацыі на I ступені навучання;

-сканструяваць верагоднасную праграму пачатковых прыродазнаўча-геаграфічных прадметаў на аснове распрацоўкі канцэптуальных палажэнняў.

Аб'ект даследавання – пачатковая прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя.

Прадмет даследавання – працэс станаўлення і развіцця пачатковай прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі на Беларусі.

Метадалогія і метады. Навукова – метадалагічнай асновай дысертацыйнага даследавання з'яўляецца дыялектычны падыход у яго прымяненні да разгляду пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі на Беларусі. Асноўныя палажэнні працы базіруюцца на філасофіі і метадалогіі сучасных навуковых ведаў, дыялектыцы як тэорыі развіцця і прынцыпе гістарызму. Канкрэтнымі метадамі і прынцыпамі даследавання выступаюць: параўнальна - гістарычны, гісторыка – лагічны, гісторыка – генетычны, гісторыка – рэтраспектыўны, параўнальны і статыстычны аналіз, сістэмны падыход, метад канструявання. Выкарыстаныя метады былі накіраваны на вывучэнне праблемы, адбор, комплексны і параўнальны аналіз, лагічнае інтэрпрэтаванне і тэарэтычнае абагульненне архіўных дакументаў, навуковых даследаванняў, вучэбных праграм, школьных падручнікаў, літаратурных крыніц, канструяванне змястоўнай мадэлі сучаснай пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі на Беларусі.

Навуковая навізна і значэнне атрыманых вынікаў. У дысертацыйнай працы:

-на аснове аналізу гістарычнага развіцця створана цэласная карціна генезісу пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі ад летапісных часоў да нашых дзён з вылучэннем асноўных перыядаў;

-прааналізаваны ўклад асобных айчынных навукоўцаў, педагогаў у развіццё зместу пачатковых прыродазнаўча–геаграфічных прадметаў і методыку іх выкладання на Беларусі;

-праведзены аналіз сучасных праблем пачатковых прыродазнаўча–геаграфічных прадметаў выкарыстаны як падстава для разгляду магчымых шляхоў, верагодных мадэляў развіцця, вырашэння сучасных праблем, распрацоўкі змястоўнай мадэлі пачатковай прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі (канцэптуальныя палажэнні, праграма вучэбных прадметаў);

-абгрунтаваны роля, месца, змест пачатковай прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі з улікам сучасных патрабаванняў грамадскага развіцця.

Практычнае (сацыяльна -эканамічнае) значэнне атрыманых вынікаў. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны:

-для абнаўлення зместу гістарычных раздзелаў курсаў "Методыка выкладання прыродазнаўства", "Методыка выкладання геаграфіі" ў педагагічных сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах Беларусі;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

-для ўдакладнення пытанняў гісторыі развіцця пачатковай адукацыі на Беларусі і адукацыі ўвогуле;

-пры стварэнні сучаснай канцэпцыі пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі, новых вучэбных курсаў з прыродазнаўча–геаграфічным зместам і пры ўдасканаленні зместу ўжо існуючых вучэбных праграм;

-у якасці камерцыйнага прадукту.

Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:

1. На сучасным этапе развіцця сістэмы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь пачатковая прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя - неад'емная частка адукацыі ў пачатковай школе, якая адыгрывае вядучую ролю ў навучанні і выхаванні малодшых школьнікаў; закладвае грунт для фарміравання навуковага светапогляду, навуковай карціны свету, экалагічнай культуры; спрыяе развіццю разумовых здольнасцей; уносіць уклад у вырашэнне задач політэхнічнай адукацыі; спрыяе гуманізацыі навучання; па зместу з'яўляецца біялагічнай, геаграфічнай і экалагічнай, а па сутнасці –прапедэўтычнай.

2. Працэс станаўлення і развіцця пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі адлюстроўвае паэтапнае развіццё прыродазнаўча - геаграфічных і псіхолага – педагагічных навук і цесна звязаны з развіццём і ўдасканаленнем зместу адукацыі ў Еўропе і свеце.

3. Выкладанне пачатковых прыродазнаўча-геаграфічных курсаў, што былі забяспечаны айчыннымі планамі і падручнікамі, было пачата да далучэння беларускіх зямель да Расіі; гэта стала падставай для распаўсюджвання перадавога вопыту беларускіх школ.

4. Развіццё пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі мела свае адметныя рысы: а) перыяд да далучэння да Расіі вызначаўся спрыяльнымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі, запатрабаванасцю ведаў у грамадстве, абавязковасцю вывучэння прыродазнаўча - геаграфічных прадметаў, айчыннымі праграмамі і падручнікамі, забяспечанасцю настаўнікамі; б) з канца XУIII стагоддзя да 1970-х гадоў яе развіццё ішло, у асноўным, у рэчышчы афіцыйнай школьнай палітыкі царскай Расіі і СССР; в) у 20-х гадах XX стагоддзя, калі з'яўляюцца рэгіянальныя праграмы, назіраецца нестабільнасць стану адукацыі і адбываюцца змены ў тэрытарыяльным складзе Беларусі; г) пасля 1970 года ажыццяўляецца пераход на вывучэнне пачатковых прыродазнаўча- геаграфічных прадметаў па праграмах з краязнаўчай асновай.

5. Змястоўная мадэль сучаснай пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі на Беларусі, якая ўключае, па –першае, інтэгравана – дыферэнцыяваныя прадметы, што ўтрымліваюць ідэю суцэласнасці свету; па- другое, цэласнасць тэхналогій вывучэння матэрыялу, якія базіруюцца на адзінстве кагнітыўных, вартасных (аксіялагічных), эмацыйна – вобразных і дзейнасных аспектаў пазнання навакольнага свету; на выкарыстанні інтэгруючых магчымасцей геаграфіі; па – трэцяе, канцэптуальныя палажэнні і змястоўную характарыстыку інтэгравана – дыферэнцыяваных дысцыплін "Светазнаўства", "Прыродазнаўства", "Радзімазнаўства".

Асабісты ўклад саіскальніка. Дадзена абгрунтаванне мэты, ролі, зместу пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі на сучасным этапе; створана цэласная

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

карціна яе станаўлення і развіцця; ускрыты сучасныя праблемы пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі; абгрунтаваны магчымыя шляхі іх вырашэння; выпрацаваны канцэптуальныя палажэнні і прапанавана праграма пачатковых прыродазнаўча –геаграфічных курсаў. Усе артыкулы па тэме дысертацыі напісаны самастойна (выключэнне складае адна брашура, што напісана ў сааўтарстве [2]).

Апрабацыя вынікаў дысертацыі. Дысертацыя абмяркоўвалася на кафедры геаграфіі і аховы прыроды Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова (1999г.). Асноўныя палажэнні і высновы працы апрабаваны на II,III,IУ міжнародных семінарах па праблемах школьнай геаграфіі (Харкаў, 1994, 1996, 1998 г.г.), навукова–практычных канферэнцыях па праблемах выкладання прыродазнаўча – матэматычных (Брэст, 1995), пачатковых (Мазыр, 1995), пачатковых прыродазнаўча–геаграфічных (Магілёў, 1998), геаграфічных (Магілёў, 1999) дысцыплін, на штогадовых канферэнцыях па выніках навукова-даследчай працы выкладчыкаў і аспірантаў Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта (1996-2000 г.г.), на пасяджэннях УІ з'езда Беларускага геаграфічнага таварыства (Магілёў, 1999), Магілёўскага аддзела Беларускага геаграфічнага таварыства (1997). Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца: у лекцыях аўтарскага курса для студэнтаў педфака МДУ "Методыка выкладання курсаў "Чалавек і свет" і "Мая Радзіма –Беларусь", у курсе "Методыка выкладання геаграфіі", на курсах і семінарах для настаўнікаў пачатковых класаў, геаграфіі ў Магілёўскім АІУН (ППК, 1993- 2000 г.г.). На аснове вынікаў даследавання распрацаваны метадычны дапаможнік "Радзімазнаўства" [1] для настаўнікаў пачатковых класаў.

Апублікаванасць вынікаў дысертацыі. Па тэме дысертацыі апублікавана 25 прац: 1 метадычны дапаможнік, 1 брашура, 20 навуковых артыкулаў (13 – у навукова-метадычных часопісах, 7- у матэрыялах навуковых дакладаў) і тэзісы 3 дакладаў. Агульны аб'ём надрукаваных матэрыялаў складае 210 старонак (14,0 ум. друк. арк.).

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, трох раздзелаў, заключэння, спісу выкарыстанай літаратуры, дадаткаў (6). Агульны аб'ём дысертацыі-139 старонак (без спісу выкарыстанай літаратуры і дадаткаў-100 старонак). Спіс выкарыстаных крыніц ўключае 377 назваў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Глава "Тэарэтыка - змястоўныя аспекты пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі" складаецца з двух раздзелаў. Першы раздзел "Сутнасць, змест, мэты і задачы пачатковай прыродазнаўча -геаграфічнай адукацыі" прысвечаны высвятленню пытанняў сутнасці, зместу, мэт пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі; вызначэнню паняццяў "пачатковая прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя", "біялагічнасць", "геаграфічнасць", "экалагічнасць" пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі.

Вызначэнне паняцця "пачатковая прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя" з'яўляецца прынцыповым. Тэрміну "прыродазнаўства" адпавядаюць тры тэрміны на рускай мове: "естествознание", "естествоведение", "природоведение". Пытанне аб змесце

і вызначэнні паняцця “естествознание” –“прыродазнаўства” з’яўляецца далёка не бескарысным з прычыны таго, што існуюць два вызначэнні гэтага паняцця: 1) ”естествознание”– навука аб прыродзе як адзінай цэласнасці; 2) ”естествознание”–сукупнасць навук аб Прыродзе. якая разглядаецца як адзінае цэлае. Але прырода існуе на розных узроўнях: узроўнях абмену рэчывам і энергіяй паміж кампанентамі прыроды; кожны з іх даследуе свая галіна навукі. Навукамі аб Прыродзе (у шырокім сэнсе) з’яўляюцца: 1) прыродазнаўчыя -фізіка, хімія, біялогія, псіхалогія; 2) геаграфічныя. Кожная з іх вывучае адпаведныя асноўныя формы руху матэрыі. Комплексныя геалагічная, біялагічная і сацыяльная формы ўваходзяць у геаграфічную (як больш высока арганізаваную). Геаграфічная форма руху матэрыі -інтэгральная. Геаграфія даследуе сістэмы: 1) прыродныя, 2) сацыяльныя, 3) прыродна – сацыяльныя. Яна мае больш шырокі прадмет даследавання, чым навукі прыродазнаўчыя, і таму не ўваходзіць у склад прыродазнаўчых навук, даследуе прыроду на больш высокіх узроўнях – на кампанентным і комплексным.

Зыходзячы з гэтых пазіцый прынцыповым з'яўляецца тэрмін “прыродазнаўча–геаграфічная адукацыя”. “Пачатковая прыродазнаўча–геаграфічная адукацыя” – працэс і вынік засваення элементарных ведаў, фарміравання ўменняў і навыкаў у пачатковай школе ў галіне прыродазнаўства і геаграфіі; адзін з першых этапаў у набыцці ў цэлым агульнай адукацыі, у падрыхтоўцы навучэнцаў да жыцця; састаўная частка сістэмы выхавання і адукацыі, што вядзе да фарміравання біялагічнай, геаграфічнай і экалагічнай культуры.

Геаграфічная культура ўключае ў сябе галоўным чынам фарміраванне геаграфічнай карціны свету, геаграфічнага мыслення, авалоданне мовай геаграфіі. Яна мысліцца шырока –у сэнсе пазнання навучэнцаў у галіне геаграфіі; характарызуе накіраванасць чалавечай дзейнасці на захаванне прыродных умоў, што неабходны для жыцця, і вызначае ступень агульнай цывілізаванасці грамадства. Экалагічная культура - гэта узровень адносін чалавека да прыроды, паказчык свядомасці, адукаванасці асобы. Біялагічная культура скіравана на пазнанне з вобласці біялогіі, на выхаванне сродкамі жывой прыроды, на тлумачэнне з’яў, а не на простую канстатацыю.

Прыродазнаўча–геаграфічная адукацыя ў пачатковай школе ажыццяўляецца праз адпаведныя школьныя прадметы (дысцыпліны) з прыродазнаўча - геаграфічным зместам (“Чалавек і свет”, ”Мая Радзіма -Беларусь”).

Мэтай пачатковай прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі з’яўляецца фарміраванне першапачатковых ведаў аб сістэме “Прырода- Чалавек –Грамадства”; геаграфічнай карціны свету (цэласны вобраз свету, што мае гістарычна–абумоўлены характар і замацоўвае асноўныя аб'екты і суадносіны паміж імі ў тым выглядзе, у якім яны дадзены сучаснаму геаграфічнаму пазнанню); выхаванне экалагічнакультурнай асобы. Асноўныя задачы пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі: 1) працягваць пачатае ў сям’і і дашкольнай установе living рознабаковае развіццё асобы дзіцяці (развіццё інтэлекту, эмоцый, творчых здольнасцей навучэнцаў і іх маральнае выхаванне); 2) паслядоўнае фарміраванне ў навучэнцаў цэласнай навуковай карціны свету; 3) фарміраванне паняццяў аб з’явах у жывой і нежывой прыродзе, аб узаемнай сувязі з’яў і працэсаў; 4) фарміраванне паняццяў аб з’явах грамадскага жыцця і прыроды, аб

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

уплыве прыроднага фактару на жыццё грамадства і антрапагеннага фактару на з'явы і працэсы, што адбываюцца ў прыродзе; фарміраванне біялагічнага, экалагічнага і геаграфічнага мыслення; 5) фарміраванне дакладных уяўленняў і паняццяў аб шчыльных сувязях і ўзаемапранікненнях у сістэме "Прырода –Чалавек –Грамадства"; 6) асэнсаванне навучэнцамі таго факта, што чалавек –частка жывой прыроды, частка прыроды ўвогуле, адзінка грамадства; усведамленне асаблівасцей будовы і функцыянавання дзіцячага арганізма, неабходнасці догляду за ім, асабістай і грамадскай гігіены; 7) узбраенне пачатковымі прыродазнаўча-геаграфічнымі ведамі для наступнага вывучэння ў сярэдняй школе прыродазнаўча-навуковых (фізіка, хімія, біялогія, астраномія, экалогія), геаграфічных і грамадазнаўчых курсаў; 8) фарміраванне ўяўленняў і паняццяў аб маральна – этычных паводзінах у грамадстве, прыродзе, аб дзейнасці ў акаляючым асяроддзі; 9) выхаванне эмацыянальна станоўчых адносін да навакольнага жыцця, інтарэсу да прыродных і сацыяльных з'яў, абуджэнне найвышэйшых пачуццяў; эстэтычнае выхаванне; 10) фарміраванне экалагічнай культуры навучэнцаў на падставе выхавання адказных адносін да прыроды.

Па сутнасці пачатковая прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя з'яўляецца біялагічнай, геаграфічнай і экалагічнай, носіць прапедэўтычны характар. Біялагізм –гэта падыход, што патрабуе тлумачэння, а не простага апісання з'яў. Геаграфізм (геаграфічнасць) заключаецца ва ўстанаўленні прычынна – вынiковых сувязей ў глабальным комплексным поглядзе на Зямлю як адзінае цэлае (геаграфія інтэгруе веды аб чалавеку, прыродзе і грамадстве), у стварэнні цэласнай карціны свету. Экалагізм – скразны напрамак, што характэрны для ўсяго міждысцыплінарнага комплексу навук, якi даследуе "экаразвіццё". Праз экалагізм сінтэзуюцца прыродазнаўчанавуковыя і гуманітарныя веды. Экалагічны падыход з'яўляецца вельмі важным пры распрацоўцы прыродазнаўча-геаграфічнага матэрыялу аб сістэме "Прырода-Чалавек-Грамадства".

Змест пачатковых прыродазнаўча-геаграфічных прадметаў ёсць вынік дыдактычнай апрацоўкі навуковага матэрыялу з вобласці прыродазнаўства і геаграфіі. Пры вызначэнні зместу ўлічваюцца навучальна – выхаваўчыя задачы школы, узроставыя асаблівасці і ўзровень падрыхтаванасці навучэнцаў, адпаведнасць узроўню развіцця навукі і грамадства, захаванне міжпрадметных сувязей. Школьныя пачатковыя прыродазнаўча–геаграфічныя прадметы хаця і будуюцца па логіцы адпаведных навуковых галін, але па кампаноўцы, чарговасці вывучэння матэрыялу шмат у чым адрозніваюцца ад іх.

У другім раздзеле аналізуюцца месца і роля прыродазнаўча – геаграфічных прадметаў у раскладзе пачатковай школы. Прыродазнаўча – геаграфічныя курсы вывучаюцца ва ўсіх чатырох класах сучаснай пачатковай школы Беларусі. На іх вывучэнне выдзяляецца ад усяго бюджэту часу пачатковай школы толькі **9,8%** (6 месца з 11 пачатковых прадметаў), у т.л. на курс"Чалавек і свет" **прыходзіцца 7,6%** (7 месца, у т.л. на блокі "Чалавек і прырода" і "Чалавек і яго здароўе" –**5,3%**); на курс "Мая Радзіма–Беларусь" – **2,2%** (10 месца, у т.л. на геаграфічны матэрыял-толькі **0,5%**, што ўтрая менш, чым выдзяляецца часу на пазакласнае чытанне і ў 35 разоў менш, чым у "форварда" сярод пачатковых прадметаў – матэматыкі). Відавочна, што на традыцыйны прыродазнаўча – геаграфічны матэрыял сучаснымі праграмамі адводзіцца толькі **5,8%** (у розны час і ў розных рэспубліках гэты паказчык вагаўся **ад 7 да 15%**) ад агульнай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

колькасці вучэбных гадзін у пачатковай школе (параўнаць: на матэматыку –17,5; беларускую мову–16,0; рускую мову–15,9; фізкультуру –13,1; працу –8,7; спевы–4,8%). Такая колькасць часу не можа адпавядаць сучасным патрэбам адукацыі.

У главе аналізуюцца магчымасці і патэнцыял пачатковых прыродазнаўча–геаграфічных курсаў для адукацыі і выхавання школьнікаў, падрыхтоўкі іх да вывучэння асноў навуковых ведаў, падрыхтоўкі да самастойнага жыцця ў грамадстве і прыродным асяроддзі. Вызначаецца роля прыродазнаўча-геаграфічных курсаў у ажыццяўленні экалагічнай адукацыі і выхавання, фарміраванні навуковага светапогляду, навуковай карціны свету, эстэтычным выхаванні, развіцці творчага мыслення, засваенні навучэнцамі практычных навыкаў і уменняў, фарміраванні ў вучняў інтарэсу да працы, пачуцця любові да роднага краю і да т.п.. Даецца ацэнка гуманітарнай, гуманістычнай і практычнай накіраванасці.

Другая глава ("Аналіз станаўлення і развіцця пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі ў розныя гістарычныя эпохі") складаецца з чатырох раздзелаў, матэрыял кожнага з якіх прысвячаецца аналізу пэўнага гістарычнага перыяду развіцця пачатковай прыродазнаўча -геаграфічнай адукацыі на Беларусі, аналізу асобных праграм, планаў, падручнікаў, дапаможнікаў па пачатковых прадметах, што выкарыстоўваліся ў пэўную эпоху; укладу палітычных дзеячоў і педагогаў.

У першым раздзеле ("Вытокі прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі") разглядаюцца пытанні вытокаў і крыніц прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі, працэсы зараджэння і станаўлення прыродазнаўства і геаграфіі, аналізуецца стан адукацыі ў розных школах; рэформы Адукацыйнай камісіі, уплыў на школу палітычных дзеячоў і асветнікаў (Ф.Скарына, Л.Зізаній, К.Лышчынскі, М.Сарбеўскі, Я.Снядзецкі, С.Канарскі, А.Доўгірд і інш..); уплыў прадстаўнікоў беларускай дыяспары (С.Полацкі, Е.Славінецкі, І.Капіевіч) на развіццё прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі Расіі.

Пачатак эпізадычнаму вывучэнню прыродазнаўча - геаграфічных звестак быў пакладзены ў часы існавання Кіеўскай Русі. Дастаткова ранняе зараджэнне і развіццё прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі на Беларусі тлумачыцца: 1) сацыяльна-эканамічным станам краіны; 2) наяўнасцю адукаваных спецыялістаў, вольных ад прыгону грамадзян; 3) геаграфічным становішчам Беларусі ў цэнтры Еўропы, на перакрыжаванні шляхоў зносін; 4) шчыльнымі культурнымі сувязямі з еўрапейскімі краінамі; 5) гісторыяй развіцця дзяржавы; 6) адноснай канфесійнай цярпімасцю, талерантнасцю грамадзян; 7) запатрабаванасцю ведаў у грамадстве.

У школах да XYI стагоддзя даваліся толькі самыя элементарныя звесткі з прыродазнаўства і геаграфіі. Гэтыя звесткі былі выпрацаваны ў выніку жыццёвай практыкі, чэрпаліся з назіранняў, з літаратурных крыніц, як замежных, так і айчынных кампілятыўных зборнікаў ("зельнікі" ,"кветнікі", "луннікі", "грамоўнікі"). Выкладаемыя звесткі насілі чыста ўтылітарны характар. У XYI–XYIII стагоддзях прыродазнаўства і геаграфія заставаліся эпізадычна- апісальнымі, але ў гэты час рабіліся спробы больш сур'ёзнага і сістэматычнага іх выкладання, захады па ўвядзенню іх ў якасці асобных і абавязковых прадметаў (геаграфія як самастойны прадмет стала выкладацца з XYII, прыродазнаўства -з XYIII ст).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прадстаўнікі пратэстанцкага руху выказваліся за неабходнасць вывучэння ў школах, сярод іншых прадметаў, прыродазнаўства і геаграфіі. У 60-70 г.г. ХУП стагоддзя адчыніліся арыянскія, кальвініскія школы, у якіх надавалася ўвага вывучэнню прыродазнаўча – геаграфічнага матэрыялу. У ХУ–ХУП стагоддзях выкладаліся прыродазнаўча –геаграфічныя звесткі і ў некаторых з брацкіх школ (у складзе розных прадметаў –астраноміі, дыялектыкі, геаметрыі, геаграфіі). Але большасць школ гэтага тыпу прыродазнаўчых ведаў не давалі. Дастаткова сур'ёзна выкладаліся прыродазнаўства і геаграфія ў школах езуітаў, уніятаў, каталіцкіх ордэнаў. У сваіх школах езуіты выкладалі геаграфію ў спалучэнні з багатым прыродазнаўчым матэрыялам (геаграфія імперый, "геаграфія натуральная і ўсеагульная аб чатырох частках свету", "геаграфія сферычная" і палітычная, "астраномія фізічная"). Самым перадавым тыпам школ на Беларусі ў адносінах да вывучэння натуральнай, геалогіі, "натуральнай маралі" і геаграфіі сталі піярскія школы.

Для школ выдаваліся перакладныя падручнікі, а таксама (асабліва шмат з ХУШст.)- арыгінальныя беларускіх аўтараў: К.Вырвіча, К.Галоўкі, Ф.Папроцкага, С.Юндзіла і інш..

Вялікую ролю ў развіцці пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі адыгралі рэформы Адукацыйнай камісіі, падчас якіх былі абвешчаны абавязковымі для вывучэння геаграфія і натуральная гісторыя (матэрыял вывучаўся ва ўсіх класах, у т.л і падрыхтоўчым). Дзеячы польска- літоўска- беларускай асветы прыйшлі да разумення неабходнасці ўвядзення ў пачатковыя класы прапедэўтычных сінтэтычных курсаў на стагоддзе раней, чым К.Ушынскі і А.Герд.

У 1786 годзе Кацярынай II была праведзена рэформа - на Беларусі адчыніліся два "галоўныя", сем "малых" вучылішчаў (змест раздзела "Выкладанне пачатковых прыродазнаўча-геаграфічных курсаў у школах Беларусі з канца ХУШ да пачатку ХХ стагоддзя"). Прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя малых вучылішчаў абмяжоўвалася чытаннем тэкстаў прыродазнаўча-геаграфічнага характару. У галоўных - выкладаліся веды з геаграфіі, прыродазнаўства. Але ў рускай школе да 1831 года даваліся, у параўнанні са школамі Адукацыйнай камісіі, больш сціплыя веды, і, як вынік, на Беларусі не толькі працягвала існаваць, але і пераважала колькасна старая польска - лацінская школа (большая частка школ па планах камісіі займалася да 1830-х, а некаторыя да 1860-х гадоў): напрыклад, толькі 47% вучняў Віцебскай і 33% Магілёўскай губерняў у 1803 годзе навучаліся ў рускіх школах.

ХIХ стагоддзе - час сур'ёзных выпрабаванняў для пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі. Кароткія перыяды падтрымкі прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі (1803-16; 1852-61; 1863-71г.г.) змяняліся працяглымі перыядамі заняпаду, асабліва прыродазнаўства: прадмет быў скасаваны ў гімназіях у 1816 годзе, адноўлены–ў 1852г. (у рускіх ніжэйшых пачатковых школах замест прыродазнаўства вывучалі "Краткое наставление..."), не было яго ў раскладзе школ і ў 1861-63 г.г., у апошняй чвэрці ХIХ стагоддзя. У выніку уніфікацыі навучальных планаў пасля 1835 года геаграфія і прыродазнаўства як асобныя прадметы былі скасаваны і ў ордэнскіх школах. Такім чынам, у 1830-60 г.г. у большасці школ Беларусі прыродазнаўства як прадмет не вывучалася.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аднаўленне вывучэння прыродазнаўства прыпадае на 1860-я гады, але становішча прадмета было нестабільным, што тлумачыцца: 1) эканамічнай адсталасцю Расіі і няўважлівымі адносінамі да школьнай справы; 2) непаслядоўнай урадавай палітыкай у адносінах да адукацыі; 3) незапатрабаванасцю ведаў у грамадстве.

Падчас рэфармавання школ у 1860-70 г.г. назіралася імкненне да развіцця прыродазнаўча- геаграфічнай адукацыі: рабіліся намаганні па ўвядзенню ў школу прыродазнаўства (у выглядзе натуральнай гісторыі, фізікі) і геаграфіі. "Статут гімназій і прагімназій" (1864г.) зацвердзіў выкладанне фізікі, касмаграфіі, геаграфіі, натуральнай гісторыі (1-4 класы). У школы быў уведзены прапедэўтычны прыродазнаўча-геаграфічны курс. У элементарных школах абавязковым станавілася вывучэнне прыродазнаўча - геаграфічнага матэрыялу на ўроках чытання.

Спачатку, у 1810-1860 г.г., у школе замацаваўся сістэматычны накірунак у вывучэнні прыродазнаўча – геаграфічнага матэрыялу, потым класіцызм і любенізм (1870-90г.г.). Адмоўным у сістэматычным накірунку былі празмерная перагрузка біялагічнай і геаграфічнай наменклатурай, факталагічным матэрыялам і, галоўнае,- некрытычнае перанясенне навукі ў школьныя прадметы. Пры ўвядзенні класіцызму ў гімназіі (1871г.) прыродазнаўчыя прадметы скасоўваліся і далучаліся да матэматыкі з фізікай і матэматычнай геаграфіі, знік і прапедэўтычны прыродазнаўчы курс. У 1871-77г.г. прыродазнаўства ў пачатковых школах Беларусі альбо зусім не вывучалася, альбо вывучалася ў скарочаным выглядзе.

Прыродазнаўча – геаграфічная адукацыя да 1860-70 г.г. мала чым адрознівалася ад адпаведнай універсітэцкай. Гэта вынікае з неразвітасці тагачасных педагогікі і псіхалогіі і, як следства, - слабой метадычнай апрацоўкі матэрыялу для навучання. Асноўнымі метадамі выкладання з'яўляліся вербальныя, зрэдку -у спалучэнні з нагляднымі і практычнымі. Пасля прац А.Любена, К.Ушынскага, А.Я.Герда і іншых метадыстаў погляды на пачатковыя прыродазнаўча – геаграфічныя прадметы і метады выкладання былі перагледжаны.

На пачатку XX стагоддзя з'явіліся новыя сінтэтычныя пачатковыя курсы са звесткамі біялагічнага і геаграфічнага характару ("Природоведение" Д.Кайгародава, "Мироведение" А.Паўлава). У 1902 годзе было дазволена выкладанне прыродазнаўча-геаграфічнага матэрыялу ў царкоўна-прыходскіх школах, а з 1904 года гэты матэрыял стаў выкладацца ва ўсіх тыпах школ Беларусі.

Згодна з рэформай 1914 года, пачатковая прыродазнаўча - геаграфічная адукацыя набывалася ў класах (падрыхтоўчы, 1-5) 1 і 2 канцэнтраў ("Прыродазнаўства", "Кароткая геаграфія Расіі", краіназнаўства з асновамі этнаграфіі, "Агульная геаграфія"). Новыя праграмы мелі шмат станоўчага, але яны не дайшлі да большасці школ Беларусі з прычыны ваеннай абстаноўкі; не закранулі і ніжэйшай пачатковай школы. Прадметы радзімазнаўства і прыродазнаўства былі ўведзены не паўсюдна, і ў большасці выпадкаў матэрыял вывучаўся па – старому- на ўроках мовы. Для школ розных тыпаў (17) не была выпрацавана адзіная праграма. На пачатку XX стагоддзя ў школах Беларусі сталі выкарыстоўвацца "чытанкі" з прыродазнаўча - геаграфічным і гістарычным матэрыялам на беларускай мове (Цётка, Я.Колас, В.Ластоўскі і інш).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Трэці раздзел прысвечаны перыяду 1917-1970 г.г., калі шляхі развіцця пачатковай прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі ў Расіі і Беларусі амаль нічым не адрозніваліся: выкарыстоўваліся агульныя праграмы, планы, падручнікі і дапаможнікі. Некаторыя адрозненні назіраліся ў перыяд 1917-22 г.г., калі цэнтральныя праграмы не даходзілі да большасці школ Беларусі з прычыны ваеннай абстаноўкі, разарванасці сувязей, і, як рэакцыя на гэта, існавалі шматлікія мясцовыя праграмы (грунтаваліся на краязнаўчай аснове). Працэс разбурэння класна - урочнай сістэмы, скасавання прадметаў, выкарыстання дальтон – плана, праектнага, брыгадна – лабараторнага метадаў, комплекснага прынцыпу выкладання, калонак ГУСа (1923-27г.г.), беларускую школу закранулі ў меншай ступені, чым у Расіі. Прычыны гэтага: разуменне настаўнікамі іх часовасці; наркамат асветы БССР жорстка не патрабаваў абавязковай працы па "новых" праграмах і метадах.

У 1927-34 г.г. ішоў працэс аднаўлення прадметна-ўрочнай сістэмы, уводзіліся стабільныя праграмы. У 1929 годзе былі распрацаваны адразу тры праграмы для пачатковай школы: у двюх прыродазнаўчы і геаграфічны матэрыял прапаноўвался вывучаць у сінтэзе; у трэцяй - асобна прыродазнаўства (1-3) і геаграфію (4 клас). Адрозненні паміж маскоўскімі і беларускімі праграмамі ў гэты час заключаліся ў колькасці тыднёвых урокаў: у Расіі ўрокаў геаграфіі ў 3 і 4 класах- адзін і два; на Беларусі –па аднаму. Далейшаму развіццю пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі спрыялі ўрадавыя пастановы 1931-34 г.г., якія вярнулі школу да прадметнай і класна-ўрочнай сістэмы, да падручнікаў, увялі ў якасці абавязковых прыродазнаўства (1-4) і геаграфію (3-4 класы), вызначылі іх змест на перспектыву.

У перыяд 1935–70 г.г. развіццё пачатковай прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі на Беларусі ішло ў рэчышчы школьнай палітыкі СССР- прыродазнаўства і геаграфія выкладаліся па саюзных праграмах, якія не заўсёды ўлічвалі рэгіянальныя асаблівасці, краязнаўчы аспект. З 1937/38 навучальнага года пачаліся пераўтварэнні ў прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі, у выніку якіх спачатку было скасавана як прадмет прыродазнаўства (1-3), потым геаграфія (3 клас). Замест прыродазнаўства і геаграфіі ўводзіліся ўрокі тлумачальнага чытання (1-3 класы), на якіх ішло вывучэнне артыкулаў з прыродазнаўча-геаграфічным зместам. Рэфармаваліся пачатковыя прадметы і ў 4 класе: прыродазнаўства стала ўяўляць сабой курс біялогіі; курс геаграфіі – толькі фізічнай геаграфіі. Гэта прывяло да паралельнага выкладання роднаснага матэрыялу, што адмоўна адбівалася на засваенні: 1) было шмат паўтораў; 2) паралельныя сістэмы паняццяў ніяк не звязваліся паміж сабой; 3) вывучэнне прыроды на ўроках гэтых двух прадметаў ішло рознымі шляхамі. У выніку - фармалізм, прафанацыя навучальнага працэсу.

Падчас рэформы 1959 года ў 4 класе пачатковай школы (матэрыял трэцяга раздзела) з'явіўся новы прапедэўтычны курс "Природоведение", які ўяўляў сабой сімбіёз прадметаў "естествознания" і геаграфіі. Пад новы прадмет падводзілася краязнаўчая аснова, уключалася дастатковая колькасць тэм з агульнага землязнаўства (55,2% ад аб'ёму), фізічнай геаграфіі СССР (34,2%).

У чацвёртым раздзеле аналізуецца стан беларускай пачатковай прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі 1970-90 г.г. – адметны перыяд развіцця беларускай пачатковай школы. Згодна з рэформай канца 1960-х гадоў з 1970/71 навучальнага года прырода-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

знаўства было ўведзена ў 2-3 класы 3-х гадовай пачатковай школы. У БССР упершыню былі распрацаваны ўласныя рэспубліканскія стабільныя праграмы, уласныя падручнікі і дапаможнікі. Першымі дапаможнікамі і падручнікамі па пачатковаму прыродазнаўству сталі "Каляндар прыроды і працы" (П.Лярскі, А.Міхайлава, 1970г.); "Прыродазнаўства" для 3 класа (П.Лярскі, 1971г.); "Прыродазнаўства" для 2 класа (А.Міхайлава, 1974г.). Галоўнымі прычынамі ўвядзення беларускіх праграм, распрацоўкі падручнікаў сталі: краязнаўчая аснова праграм; набыты неабходны вопыт у стварэнні падручнікаў беларускімі вучонымі; спрыяльныя сацыяльна - эканамічныя ўмовы рэспублікі.

У 1980 гадах пазіцыі прыродазнаўча - геаграфічных курсаў яшчэ больш узмацніліся: спачатку павялічыўся ўдвая вывучаемы матэрыял (3 клас- да 70 гадзін), потым (з 1987г.) ён стаў вывучацца ва ўсіх 4-х класах пачатковай школы. Прыродазнаўча-геаграфічныя прадметы сталі займаць цэнтральнае месца ў інтэграцыі пачатковых прыродазнаўчых, геаграфічных, грамадазнаўчых, гістарычных, валеалагічных, экалагічных ведаў.

У дадзеным раздзеле аналізуецца ўклад у развіццё сучаснай пачатковай прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі заснавальніка беларускай школы метадыстаў пачатковага прыродазнаўства П.А.Лярскага – аўтара і сааўтара першых на Беларусі дапаможнікаў, падручнікаў па геаграфіі і землязнаўству для студэнтаў педагагічных факультэтаў ВНУ, па краязнаўству–для географаў, па прыродазнаўству -для вучняў пачатковых школ, для настаўнікаў; распрацоўшчыка асобных пытанняў методыкі (выкарыстанне дзённікаў назіранняў; пастаноўка доследаў; методыка назіранняў; фарміраванне ўяўленняў і паняццяў; безмашынны праграмаваны кантроль на ўроках прыродазнаўства). Па падручніках П.Лярскага беларускія школьнікі плённа займаліся на працягу 25 гадоў. (Агульны наклад падручнікаў больш за 4,5 мільёнаў паасобнікаў).

У трэцяй главе ("Сучасны стан і накірункі развіцця пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі") аналізуюцца праблемы пачатковай прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі, верагодныя мадэлі развіцця, выпрацоўваюцца канцэптуальныя палажэнні і праграма пачатковых прадметаў з прыродазнаўча – геаграфічным зместам.

У першым раздзеле ("Пачатковая прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя ў свеце і на Беларусі на сучасным этапе") даецца аналіз зместу, стану выкладання пачатковых прыродазнаўча-геаграфічных прадметаў ў розных краінах свету, вызначаюцца агульныя тэндэнцыі развіцця беларускай і сусветнай пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі. У развіцці пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі розных краін свету шмат агульнага, у т.л. і накірунак на інтэграцыю ведаў аб навакольным асяроддзі. Вопыт развіцця замежнай, расійскай, айчыннай пачатковай школы паказвае немэтазгоднасць вывучэння прыроды ў розных асобных (аналітычных) пачатковых курсах.

Раздзел "Сучасныя праблемы і змястоўныя мадэлі развіцця пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі" прысвечаны аналізу сучаснага стану і высвятленню праблем пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі: 1) інтэграцыі дыферэнцыяваных частак -блокаў; 2) аптымізацыі суадносін паміж вучэбным часам і аб'ёмам вывучаемага матэрыялу; 3) абмежавання агульназемлязнаўчага матэрыялу; 4)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пераемнасці курсаў; 5) прыніжэння ролі назіранняў і экскурсій; 6) экалагізацыі і геаграфізацыі; 7) матэрыяльна – тэхнічнага забеспячэння; 8) навучальных комплексаў. Да асноўных становучых момантаў сучаснай пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі адносяцца: 1) прагрэс у распрацоўцы зместу адукацыі; 2) высокі тэарэтычны ўзровень, дастатковы аб'ём паняццевага апарату, уважлівасць да разгляду сувязей і заканамернасцей паміж кампанентамі прыроды, унутры асобных кампанентаў, комплексаў; 3) навуковасць падыходаў пры разглядзе біялагічнага і сацыяльнага ў чалавеку; 4) інтэграцыя краязнаўчага матэрыялу праз увядзенне новых курсаў, што звязала геаграфічнае, эколага -біялагічнае, літаратурнае і гістарычнае краязнаўства.

Разгледжаны магчымыя шляхі вырашэння сучасных праблем, верагодныя мадэлі далейшага развіцця. Выснова: будучае належыць інтэгравана– дыферэнцыяваным пачатковым прыродазнаўча-геаграфічным курсам. На аснове аналізу сучасных праблем, шляхоў іх вырашэння, гістарычнай спадчыны выпрацаваны асноўныя канцэптуальныя палажэнні сучаснай пачатковай прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі, сканструявана праграма прадметаў "Светазнаўства" (0-1 (1-2), "Прыродазнаўства" (2 (3), "Радзімазнаўства" (3 (4) класы).

У заключэнні сфармуляваны асноўныя высновы дысертацыйнай працы.

1. Пачатковая прыродазнаўча–геаграфічная адукацыя –гэта працэс і вынік засваення элементарных, прапедэўтычных па функцыі ведаў, фарміравання ўменняў і навыкаў у пачатковай школе ў галіне прыродазнаўства і геаграфіі. Па сутнасці пачатковая прыродазнаўча - геаграфічная адукацыя з'яўляецца біялагічнай, геаграфічнай, экалагічнай і носіць прапедэўтычны характар.

Мэтай пачатковай прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі з'яўляецца выхаванне экалагічна культурнай асобы; фарміраванне першапачатковых ведаў аб прыродзе, грамадстве, чалавеку; цэласнай навуковай карціны свету.

Асноўныя задачы пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі:

а) працягваць пачатае ў сям'і і дашкольнай установе рознабаковае развіццё асобы дзіцяці (развіццё інтэлекту, эмоцый, творчых здольнасцей навучэнцаў і іх маральнае выхаванне);

б) паслядоўнае фарміраванне ў навучэнцаў цэласнай навуковай карціны свету;

в) фарміраванне паняццяў аб з'явах у жывой і нежывой прыродзе, аб узаемнай сувязі з'яў і прыродных працэсаў;

г) фарміраванне паняццяў аб з'явах грамадскага жыцця і прыроды, аб уплыве прыроднага фактару на жыццё грамадства і антрапагеннага фактару на з'явы і працэсы, што адбываюцца ў прыродзе; фарміравання біялагічнага, экалагічнага і геаграфічнага мыслення;

д) фарміраванне дакладных уяўленняў і паняццяў аб шчыльных сувязях і ўзаемапранікненнях у сістэме "Прырода –Чалавек –Грамадства";

е) асэнсаванне навучэнцамі таго факта, што чалавек –частка жывой прыроды, частка прыроды ўвогуле, адзінка грамадства; усведамленне асаблівасцей будовы і функцыянавання дзіцячага арганізма, неабходнасці догляду за ім, асабістай і грамадскай гігіены;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ж) узбраенне пачатковымі прыродазнаўча-геаграфічнымі ведамі для наступнага вывучэння ў сярэдняй школе прыродазнаўча - навуковых (фізіка, хімія, біялогія, астраномія, экалогія), геаграфічных і грамадазнаўчых курсаў;

з) фарміраванне ўяўленняў і паняццяў аб маральна – этычных паводзінах у грамадстве, прыродзе, аб дзейнасці ў акаляючым асяроддзі;

і) выхаванне эмацыянальна станоўчых адносін да навакольнага жыцця, інтарэсу да прыродных і сацыяльных з'яў, абуджэнне найвышэйшых пачуццяў; эстэтычнае выхаванне;

к) фарміраванне экалагічнай культуры навучэнцаў на падставе выхавання адказных адносін да прыроды.

Пачатковая прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя мае вялікія магчымасці для адукацыі і выхавання малодшых школьнікаў: у падрыхтоўцы іх да вывучэння асноў навуковых ведаў, у фарміраванні навуковага светапогляду, у падрыхтоўцы да самастойнага жыцця ў грамадстве (прафесійная арыентацыя, выхаванне такіх якасцей асобы, як назіральнасць, акуратнасць, працавітасць); адказных, беражлівых адносін да людзей, да іх і да свайго асабістага здароўя, да прыроды; у навучанні мысліць маштабна і комплексна. Пачатковыя прыродазнаўча-геаграфічныя курсы адыгрываюць вядучую ролю ў экалагічнай адукацыі і выхаванні, эстэтычным выхаванні школьнікаў, спрыяюць развіццю разумовых здольнасцей, уносяць уклад і ў вырашэнне задач політэхнічнай адукацыі і працоўнага выхавання, спрыяюць гуманізацыі і гуманітарызацыі навучання. У гэтых прадметах закладзены асновы разумення вучнямі ўзаемасувязей прыроды і грамадства.

Адпаведна паступоваму развіццю прыродазнаўча – геаграфічных і псіхолага–педагагічных навук змяняліся сутнасць, змест і мэты пачатковай прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі. Сутнасць, змест, мэты залежаць і ад узроўню грамадскага развіцця, змен у сацыяльна-эканамічным жыцці, у адпаведнасці з гістарычнай, палітычнай абстаноўкай, ад псіхолага–узроставых асаблівасцей навучэнцаў, запатрабаванняў часу. [18; 19]

2. Пачатковая прыродазнаўча - геаграфічная адукацыя на Беларусі мае сваю багатую і самабытную гісторыю, якая звязана з развіццём адукацыі ў Еўропе і свеце і прайшла ў сваім развіцці стадыі: сінкрэтычную, аналітычную, сінтэтычную; зараз знаходзіцца на стадыі інтэгральна – дыферэнцыйнай.

У XI –XIII стагоддзях у школах, што ўзнікалі на тэрыторыі Беларусі, падаваліся абмежаваныя элементарныя звесткі аб прыродзе. Яны чэрпаліся з назіранняў і царкоўнай літаратуры. Веды аб прыродзе былі ведамі практычнага характару: з вобласці практычнай батанікі, заалогіі, архітэктуры. Перадача прыродазнаўчых ведаў ажыццяўлялася ў тых школах, дзе навучалі будаўніцтву, прыёмам вядзення сельскай гаспадаркі.

У XIY-XYII стагоддзях прыродазнаўча-геаграфічны матэрыял вывучаўся ў складзе такіх школьных прадметаў, як касмаграфія, геаметрыя, астраномія. У канцы XYII стагоддзя у беларускай школе з'явілася геаграфія ў якасці асобнага прадмета. У 1-палове XYII стагоддзя прыродазнаўчы матэрыял стаў выкладацца ў складзе

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"натуральнай гісторыі". Адзіных патрабаванняў і спецыяльных дапаможнікаў для ўсіх школ не існавала.

Да пачатку ХУШ стагоддзя пры выкладанні прыродазнаўства і геаграфіі выкарыстоўвалі ў асноўным перакладныя падручнікі. З ХУШ - сталі шырока ўжывацца падручнікі беларускіх і польскіх аўтараў (Ф.Папроцкі, К.Вырвіч, К.Галоўка, С.Юндзіл і інш.).

Значны ўплыў на развіццё адукацыі аказала рэформа Адукацыйнай камісіі, якая ўзаконіла і замацавала становішча прыродазнаўча-геаграфічных курсаў у беларускай школе. Да рэформы Адукацыйнай камісіі 1773г. не існавала школьнай сістэмы ў сучасным разуменні і не было сістэматычнага вывучэння асноў прыродазнаўства і геаграфіі, змест прадметаў у асноўным вызначаўся падручнікамі, адзіных патрабаванняў і спецыяльных навучальных дапаможнікаў для ўсіх школ не існавала. І ўсё гэта тлумачыцца аб'ектыўнымі прычынамі, галоўная з якіх - неразвітасць педагогікі і псіхалогіі.

Прыродазнаўчыя і геаграфічныя курсы выкладаліся на польскай і беларускай (рускай) мовах у пратэстанцкіх, каталіцкіх, некаторых свецкіх школах, на рускай (маскоўскай)–пераважна ў праваслаўных школах і школах беларуска–маскоўскага памежжа. Выкладчыкамі прыродазнаўча –геаграфічных курсаў з'яўляліся, як правіла, людзі адукаваныя: выпускнікі Кракаўскага, Віленскага і іншых еўрапейскіх універсітэтаў, Віленскай настаўніцкай семінарыі. Але з прычыны неразвітасці методык выкладання яны не мелі яснага разумення розніцы паміж ведамі навуковымі і школьнымі. Асноўнымі метадамі выкладання з'яўляліся вербальныя, зрэдку- у спалучэнні з нагляднымі і практычнымі.

На развіццё прыродазнаўча- геаграфічнай адукацыі (да ХУШ ст.) аказалі ўплыў беларускія і польскія асветнікі і мысліцелі К.Тураўскі, С.Будны, Л.Зізаній, С.Полацкі, М.Сарбеўскі, К.Лышчынскі, І.Капіевіч, С.Канарскі і інш.. Беларускія асветнікі (Е.Славінецкі, І.Капіевіч і інш.) аказалі станоўчы ўплыў і на развіццё прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі ў Расіі. [8; 14]

**3.** Дастаткова ранняе станаўленне і развіццё прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі на Беларусі (да ХУШст.) тлумачыцца: а) сацыяльна-эканамічным станам краіны; б) наяўнасцю адукаваных спецыялістаў, вольных ад прыгону грамадзян; в) геаграфічным становішчам Беларусі ў цэнтры Еўропы, на перакрыжаванні шляхоў зносін; г) шчыльнымі культурнымі сувязямі з еўрапейскімі краінамі; д) гісторыяй развіцця дзяржавы (Беларусь амаль не адчула на сабе татара – мангольскага іга; у ёй не было такога моцнага ўплыву праваслаўнай царквы, якая, напрыклад, у Расіі была праціўнікам навукі, адукацыі і выступала супраць выкладання на лацінскай мове, без ведання якой нельга было трапіць вучыцца ва універсітэты Еўропы); е) адноснай канфесійнай цярпімасцю, талерантнасцю, што выражалася ў дзейнасці на Беларусі школ розных канфесій: праваслаўнай, пратэстанцкай, каталіцкіх ордэнаў; ж) запатрабаванасцю ў грамадстве прыродазнаўча-геаграфічных ведаў. [8; 14]

**4.** Далейшае развіццё пачатковай прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі на Беларусі (з канца ХУШ стагоддзя да 1917 года) ішло, у асноўным, у рэчышчы афіцыйнай школьнай палітыкі царскай Расіі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 1810-1860 г.г. у школе замацаваўся сістэматычны, дэдуктыўна- апісальны накірунак у вывучэнні матэрыялу. Яго галоўным недахопам было некрытычнае перанясенне навукі ў школьнае прыродазнаўства. У школах Беларусі прыродазнаўства як прадмет у 1816-31 г.г. было скасавана ў большасці школ. Яно было адноўлена ў 1860-я гады, але становішча прадмета было вельмі нестабільным. Гэта тлумачыцца: а) эканамічнай адсталасцю Расіі ў цэлым і няўважлівымі адносінамі да школьнай справы ў прыватнасці; б) непаслядоўнай урадавай палітыкай у адносінах да прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі; в) незапатрабаванасцю ведаў у грамадстве.

У 1860-80 г.г. выкладанне прыродазнаўчых дысцыплін набыло індуктыўна-апісальны характар. У гэты час сталі больш шырока выкарыстоўвацца наглядныя і практычныя метады выкладання. Стала зразумелым, што універсітэцкія і школьныя курсы адрозніваюцца не толькі па аб'ёме выкладаемых звестак, але і па метадах выкладання, ступені апрацоўкі зместу. [15; 16]

На мяжы XIX і XX стагоддзяў на аснове распрацовак А.Герда, Л.Сеўрука [7], Д.Н.Кайгародава [5], зроблены першыя станоўчыя спробы па стварэнню пачатковых сінтэтычных прыродазнаўчых прадметаў. З гэтага часу пачынаецца развіццё біялагічнага накірунку ў вывучэнні прыродазнаўча-геаграфічнага матэрыялу. Пры навучанні сталі выкарыстоўвацца разнастайныя метады з груп вербальных, наглядных, практычных метадаў. Значны ўклад у развіццё зместу прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі, развіццё навучальных прадметаў, методыку выкладання ўнеслі ўраджэнцы Беларусі Д.Сямёнаў [4], Д.Кайгародаў, Л.Сеўрук, Я.Колас, В.Ластоўскі і інш.. [16]

5. З 1917 года прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя стала вольнай ад рэлігійных догматаў і ідэалістычных тлумачэнняў прыродных з`яў. Элементы прыродазнаўства і геаграфіі сталі абавязковымі для вывучэння. "Вяршынямі" ў пошуках новага зместу, мэт, сутнасці, метадаў і форм выкладання сталі 1920-30-я, 1950-я і 1970-80-я г.г.. У 1930-х гадах прыродазнаўча-геаграфічны матэрыял выкладаўся ва ўсіх чатырох класах пачатковых школ. У 1959-м з'явіўся новы сінтэтычны курс "Прыродазнаўства". З 1970-х гадоў сінтэтычныя прыродазнаўчыя прадметы ў пачатковых школах Беларусі сталі вывучаць па беларускіх праграмах і падручніках. Значны ўклад у развіццё айчыннай пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі ўнёс П.А.Лярскі. [1; 2; 9; 10; 17]

6. У пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі Беларусі існуе шэраг праблем (адбору вывучаемага матэрыялу, нераемнасці паміж асобнымі курсамі, паміж пачатковай і сярэдняй школай, правядзення назіранняў, выкарыстання карты і геаграфічнай наменклатуры і інш..). [1; 3; 6; 11; 23; 24; 25] Галоўная з іх - праблема інтэграцыі прыродазнаўча–геаграфічных ведаў.[12] У пачатковай школе неабходны інтэгравана-дыферэнцыяваныя прыродазнаўча–геаграфічныя прадметы, якія ўтрымліваюць ідэю суцэльнасці свету. Гэта ідэя можа быць рэалізавана пры інтэграцыі наступных асноўных падыходаў: а) цэласнасці педагагічнай сістэмы на ўзроўні пастаноўкі мэт, задач, прагназавання вынікаў; б) цэласнасці зместу на аснове ўзмацнення інтэграцыйных працэсаў і сістэмнага падыходу ў адукацыі; в) цэласнасці тэхналогій вывучэння прыродазнаўча–геаграфічнага матэрыялу, якія базіруюцца на адзінстве кагнітыўных, вартасных (аксіялагічных), эмацыйна–вобразных і дзейнасных

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

аспектаў пазнання навакольнага свету; г) выкарыстанні інтэграцыйных магчымасцей геаграфіі.[13]

Выпрацаваныя ў дысертацыі канцэптуальныя палажэнні і праграмы пачатковых прыродазнаўча-геаграфічных дысцыплін "Светазнаўства", "Прыродазнаўства" і "Радзімазнаўства" накіраваны на вырашэнне сучасных праблем пачатковай прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і могуць разглядацца як альтэрнатыўныя для існуючых у школе прадметаў. [20; 21; 22]

Распрацаваныя падыходы да канструявання сучаснай змястоўнай мадэлі пачатковай прыродазнаўча - геаграфічнай адукацыі на Беларусі не разглядаюцца аўтарам як адзіна магчымыя.

## Апублікаванасць вынікаў

### 1.Метадычны дапаможнік і брашура

1.Шаруха І.М. Радзімазнаўства: Прыкладныя распрацоўкі ўрокаў па геаграфічнай частцы курса "Мая Радзіма –Беларусь" (У дапам. настаўніку пач. класаў). –Мінск: Выд.-ва "Золак", 1997. –72 с.

2.Шарухо И.И., Ридевский Г.В. П.А.Лярский: 80 лет со дня рождения. –Могилёв: ХЭЛП, 1998. –34 с /у сааўт/.

### 2. Артыкулы

3.Шарухо И.Н. Изучение географии родного края в курсе "Моя Родина–Беларусь" //Современное состояние и перспективы изучения географии родного края в школах: Матер. II науч.–метод. семинара /Харьк. гос.ун-т. –Харьков, 1994. –С. 61-62.

4. Шаруха І.М. Педагог і географ: 160 гадоў з дня нараджэння Д.Д.Сямёнава //Адукацыя і выхаванне.–1995.-№ 3.–С. 108-112.

5. Шаруха І.М. Заснавальнік пачатковага прыродазнаўства [Кайгародаў Д.Н.] //Адукацыя і выхаванне. –1996. –№ 8. –С. 114–120.

6. Шарухо И.Н. Формирование и развитие географических понятий в интегрированном курсе "Чалавек і свет" //Непрерывное географическое образование: новое в содерж. и методике. Матер. III междунар. науч. –метод. семинара /Харьк. гос. ун-т. – Харьков, 1996.–С. 29.

7. Шаруха І.М. "Зорка"расійскага прыродазнаўства //Адукацыя і выхаванне.– 1997.-№ 10.–С. 120–124.

8. Шаруха І.М. Крыніцы прыродазнаўча –геаграфічных ведаў на Беларусі са старажытнасці да 1795года // Магілёўская Даўніна. –1997. -№ 5. –С. 113-121.

9. Шаруха І.М. Развіццё пачатковага прыродазнаўства на Беларусі (1970–80гг.) //Матер. исследов. молодых учёных, аспирантов [Сб.ст.] /Под ред. проф. М.В.Мащенко /Могилёв. гос. ун.-т.-Могилёв, 1997. –С. 203 –206.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10. Шаруха І.М. Уклад П.А.Лярскага ў развіццё пачатковай прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі //Школьное естеств.-геогр. образование: проблемы, поиски и персп.. Матер. межвуз.науч.-практич. конф. 25-26 марта 1998г. /Могилёв.гос.ун-т. – Могилёв, 1998.–С. 38–40.

11. Шаруха І.М.Сучасныя праблемы прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі // там жа. –С.40 –41.

12. Шаруха І.М. Інтэграцыі ведаў не атрымалася //Пач. школа. –1998. -№ 8.–С.10-11.

13. Шарухо И.Н. Конструирование школьных курсов на основе географических принципов //Непрерыв. геогр. образование: инновац. методы и технологии. Матер.IY междунар. науч. –метод. семинара /Харьк.гос.ун-т.–Харьков, 1998.–С. 29 –30.

14. Шаруха І.М. Вытокі прыродазнаўча –геаграфічных ведаў на Беларусі //Адукацыя і выхаванне. –1998. -№ 10. –С.121 –126.

15. Шаруха І.М. Пачатковая прыродазнаўча-геаграфічныя курсы ў школах Беларусі з канца XYIII да канца XIX стагоддзя //Адукацыя і выхаванне.-1998.- № 11.–С. 112-118.

16. Шаруха І.М. Гісторыя пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі (1860-1920г.г.) //Адукацыя і выхаванне.-1999.-№№ 1-2.-С. 78-82.

17. Шаруха І.М. Гісторыя пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі (1920-1980г.г.) //Адукацыя і выхаванне.-1999.-№№ 3-4.-С. 67-77.

18.Шаруха І.М. Змест сучаснай пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі //Матэр.УІ з'езда Беларускага геаграфічнага таварыства (27 верасня–1 кастрычніка 1999 года, г.Магілёў) /Адк. рэд. В.С.Аношка. –Мінск: Выд-ва БДУ, 1999. –С. 345 –347.

19.Шаруха І.М. Вызначэнне сутнасці і мэт сучаснай пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі //Веснік МДУ імя А.Куляшова. –1999. -№ 4. – С. 123-132.

20.Шаруха І.М. Аўтарская праграма прыродазнаўча-геаграфічных курсаў: (Сутнасць і мэты. Асноўныя палажэнні аўтарскай канцэпцыі) //Пач.школа. –1999. -№ 11. –С.30-32.

21.Шаруха І.М. Аўтарская праграма прыродазнаўча-геаграфічных курсаў: (Сучасны стан пачатковай прыродазнаўча – геаграфічнай адукацыі) //Пач. школа. –1999. -№ 12.–С.14-16.

22.Шаруха І.М. Аўтарская праграма прыродазнаўча-геаграфічных курсаў //Пач. школа. –2000. -№ 2. –С. 27-29.

## 3. Тэзісы дакладаў

23. Шаруха І.М. Праблемы пераемнасці пачатковага курса прыродазнаўства і геаграфіі //Беларуская пачатковая школа: прабл. і персп. развіцця. Зб. тэз. дакладаў Рэсп. навук.-метад. канф. /Мазырскі пед. ін-т. –Мазыр, 1994.–С. 199.

24. Шаруха І.М. Да пытання аб методыцы выкладання геаграфічнай часткі курса "Мая Радзіма–Беларусь"//Праблемы выкладання прыродазнаўча –матэматычных дысцыплін ва ўмовах мадэрнізацыі вучэбных планаў і праграм: Тэз. навук.–практ. канф. /Брэсц. дзярж. ун.-т. –Брэст, 1995.–С. 49–51.

25. Шаруха І.М. Эколага–краязнаўчая праца ў пачатковай школе //там жа.-С.52–54.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## РЭЗЮМЭ

**ШАРУХА Ігар Мікалаевіч**

**СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ПАЧАТКОВАЙ ПРЫРОДАЗНАЎЧА - ГЕАГРАФІЧНАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ (са старажытных часоў да XXст.)**

Ключавыя словы: пачатковая прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя, пачатковае прыродазнаўства, пачатковая геаграфія, геаграфізм, біялагізм, экалагізм, праблемы, змястоўная мадэль, канцэптуальныя палажэнні, праграма.

Аб'ект даследавання – пачатковая прыродазнаўча-геаграфічная адукацыя.

Прадмет даследавання– працэс станаўлення і развіцця пачатковай прыродазнаўча–геаграфічнай адукацыі на Беларусі.

Мэта даследавання - асэнсаванне гістарычнай спадчыны, сучасных працэсаў, сутнасці, мэт, абгрунтаванне ролі і месца, зместу пачатковай прыродазнаўча -геаграфічнай адукацыі ў агульнай пачатковай адукацыі для аналізу сучасных праблем, выпрацоўкі змястоўнай мадэлі пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі.

Метады даследавання: параўнальна-гістарычны, гісторыка–лагічны, гісторыка–генетычны, метад канструявання, аналіз і абагульненне айчыннага і замежнага вопыту, аналіз вучэбных планаў, праграм.

Навуковая навізна даследавання: створана цэласная карціна генезісу пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі; прааналізаваны верагодныя мадэлі развіцця; распрацавана змястоўная мадэль пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі; абгрунтаваны яе роля, месца, змест з улікам сучасных патрабаванняў грамадскага развіцця.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны: для абнаўлення зместу курсаў "Методыка выкладання прыродазнаўства", "Методыка выкладання геаграфіі" у педагагічных сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах Беларусі; для ўдакладнення пытанняў гісторыі развіцця пачатковай адукацыі на Беларусі і адукацыі ўвогуле; пры стварэнні сучаснай канцэпцыі пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі на Беларусі, новых вучэбных курсаў з прыродазнаўча–геаграфічным зместам і пры ўдасканаленні зместу ўжо існуючых вучэбных праграм.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## РЕЗЮМЕ

**ШАРУХО Игорь Николаевич**

# СТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИТИЕ НАЧАЛЬНОГО ЕСТЕСТВЕННО-ГЕОГРАФИЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ В БЕЛАРУСИ (с древнейших времен до – XX в.)

Ключевые слова: начальное естественно-географическое образование, природоведение, география в начальной школе, географизм, биологизм, экологизм, проблемы, содержательная модель, концептуальные положения, программа.

Объект исследования – начальное естественно – географическое образование.

Предмет исследования – процесс становления и развития начального естественно – географического образования в Беларуси.

Цель исследования -осмысление исторического наследия, современных процессов, сущности, целей, обоснование роли и места, содержания начального естественно – географического образования в общем начальном образовании для анализа современных проблем, разработки содержательной модели начального естественно – географического образования.

Методы исследования: сравнительно-исторический, историко– логический, историко–генетический, историко – ретроспективный, сравнительный, конструирования, анализ и обобщение отечественного и зарубежного опыта, анализ учебных планов, программ.

Научная новизна: создана целостная картина генезиса начального естественно –географического образования в Беларуси; проанализированы вероятностные модели развития; разработана содержательная модель начального естественно –географического образования; дано обоснование её роли, места, содержания с учетом современных требований общественного развития.

Результаты исследования могут быть использованы: для обновления разделов курсов "Методика преподавания природоведения", "Методика преподавания географии"; для уточнения и дополнения вопросов истории развития начального образования на Беларуси и в целом истории образования; при создании концепции начального естественно-географического образования; при конструировании новых начальных курсов с естественно-географическим содержанием и при усовершенствовании содержания уже существующих программ и учебных предметов.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## SUMMARY

**SHARUKHA Igor Nicolaevich**

## DEVELOPMENT OF THE PRIMARY NATURAL-GEOGRAPHICAL EDUCATION IN BELARUS (ancient times – XX c.)

Keywords: primary natural-geographical education, history of development, primary natural history, primary geography, geographism, biologism, ecologism, modern condition, geographical scene of the world, conceptual primary of positions of the natural - geographical education.

Object for research: primary natural-geographical education.

Subjects for research: development of the primary natural-geographical education in belarus

The purpose of the study is the interpretation of the historical heritage as well as the modern processes in primary natural – geographical education in Belarus. On the grounds of the analysis of pedagogical, historical, geographical, philosophical literature on the problem of the thesis, analysis and comparison of scholastic programs, plans, the structures of manuals, scholastic aids, separate programs, the periodicity of the history and features of separate periods of the primary development of natural – geographical education, have been given: the problems of essence, composition of the primary natural - geographical education, motivations of the place and role of natural-geographical education in primary education, are being interpreted modern problems and the ways of their decision are offered a conception of natural-geographical education and curriculum of primary courses with natural – geographical contents.

Methods of research: comparative-historical, historic–logical, comparative, statistical analysis, composition, systematic.

The results of this research can be used for making up the history sections of the courses "Methods for teaching primary natural history", "Methods of geography", for revision and expansion of questions of history of development primary education of Belarus and as a whole the history of education, when making up the concepts of primary natural-geographical education, while constructing new primary courses with natural-geographical contents and while improving the contents of already existing programs and scholastic subjects.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова